Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па навуковай рабоце
БДУКМ
___________В.Р. Языковіч
"26" чэрвеня 2019 г.
Рэгістрацыйны № ВД-146/эвуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ХРАНАТОП І СТЫЛЬ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей:*
*1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках),*
*1-21 04 02 Мастацтвазнаўства (па напрамках),*
*1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць*

2019

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандартавышэйшай адукацыі ОСВО 1-21-04 01-2013 па спецыяльнасц1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках) і вучэбных планаў па спецыялізацыям рэг. № Д21-1-70/17 вуч.; Д21-1-69/17 вуч.; Д21-1-71/17 вуч.; Д21-1-73/17 вуч. ад 05.07.2017

СКЛАДАЛЬНІК:
*Т.Ф.Сухоцкая*, дацэнт кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат культуралогіі, дацэнт.

РЭЦЭНЗЕНТЫ:
*Ю.Ю. Захарына*, загадчык кафедры тэорыі і методыкі выкладання мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», доктар мастацтвазнаўства, дацэнт;
*Т.М. Смолікава*, дацэнт кафедры міжкультурных камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі

РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:
кафедрай культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 12 ад 29.05.2019);
прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 5 ад 12.06.2019).

Адказны за выпуск: Т.Ф.Сухоцкая

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Актуальнасць вучэбнай дысцыпліны “Хранатоп і стыль беларускай культуры” ў сістэме вышэйшай культуралагічнай адукацыі абумоўлена яе накіраванасцю на фарміраванне тэзаўруса, які адлюстроўвае рэгіянальную і нацыянальную спецыфіку культуры, што не толькі паглыбляе прафесійную падрыхтоўку студэнтаў, але і дапамагае фарміраванню ў іх грамадзянскіх і патрыятычных якасцей.

Навукова-метадычны ўзровень інтэрпрэтацыі культуры ў вучэбным працэсе залежыць ад ступені валодання навыкамі культуралагічнага аналізу-сінтэзу. Праграма распрацаваны з улікам спецыфікі падрыхтоўкі спецыяліста-культуролага і тэарэтычных дасягненняў айчыннай культуралогіі.

Мэтай вучэбнай дысцыпліны з’яўляецца сістэматызацыя і паглыбленне тэарэтычных ведаў, атрыманых па дысцыплінах культуралагічнага цыклу: прадугледжваецца аналіз цэнтралізуючай інтэнцыі хранатоп і стыль культуры.

– Задачы:

– раскрыццё сістэмы культуралагічнага аналізу на ўзроўнях апісальным, семіялагічным, прагматычным;

– характарыстыка і сістэматызацыя топікі;

– раскрыццё семантыкі хранатопу;

– фарміраванне тэзаўруса, які адлюстроўвае канструктыўныя інтэнцыі нацыянальнага стылю;

– удасканаленне навыкаў валодання прынцыпамі сінтэзацыі ведаў з розных галін гуманітарнага ведання;

– выпрацоўка новых светапоглядных арыенціраў з пазіцый гуманістычнага мыслення ва ўмовах тэхнакратычнага, інфармацыйнага грамадства;

– фарміраванне у студэнтаў ведаў і навыкаў самастойнай работы аналізу тэкстаў культуры з мэтай характарыстыкі хранатопа і стылю.

Вучэбная дысцыпліна «Хранатоп і стыль беларускай культуры» прадугледжвае актуалізацыю міжпрадметных сувязей з такімі вучэбнымі дысцыплінамі як: гісторыя Беларусі, філасофія, этыка, сацыялогія, гісторыя Беларусі, мастацтвазнаўства, літаратуразнаўства.

У выніку вывучэння дадзенага спецкурса студэнты павінны ведаць:

– сістэму культуралагічнага аналізу на ўзроўнях апісальным, семіялагічным, прагматычным;

– асноўныя інтэрпрэтацыі хранатопа ў беларускай і замежнай гуманітарыстыцы;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– тэзаўрус, які адлюстроўвае канструктыўныя інтэнцыі нацыянальнага стылю.

умець:

– хранатоп у культуры як ступень інтэнсіфікацыі культурнага жыццядзеяння ў прасторы і часе;

– стыль культуры як спосаб жыццядзеяння яе крэатыўных сэнсаў, сканцэнтраваных у структуры нацыянальнага тэксту і вербальнай сістэме яго кодаў;

– топасы як апазнавальныя знакі культурнай прасторы – структурна функцыянальнае падабенства тэкстаў ці кампанентаў;

– на аснове семіятычнай логікі аналізаваць тэксты культуры, ствараць кантэкст і рабіць вербальнае выказванне;

дынаміку інтэнцыяў культурнага сэнсу;

– топасы ў творах розных відаў мастацтва.

валодаць:

– культуралагічным аналізам-сінтэзам;

– мабільнай дыдактычнай мадэллю выкладання дысцыпліны.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Міфалогія Кітая і Беларусі: агульнае і спецыфічнае» павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў наступных акадэмічных кампетэнцый:

АК-1. Валодаць і ўмець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды у галіне міфалогіі для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам.

АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-5. Быць здольным параджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

АК-6. Валодаць міждысцыплінарыным падыходам да вырашэння праблем.

АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

АК-9. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

Студэнт павінен развіць наступныя сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:

САК-1. Валодаць грамадзянскімі якасцямі.

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобаснай камунікацыі.

САК-5. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі.

САК-6. Умець працаваць у камандзе.

САК-7. Умець фарміраваць і абараняць уласныя меркаванні.

Студэнт павінен набыць наступныя прафесійныя кампетэнцыі:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– арганізацыйна-кіраўніцкая дзейнасць:

ПК-7. Выкарыстоўваць у прафесійнай дзейнасці найноўшыя інфармацыйныя тэхналогіі;

– аналітычная дзейнасць:

ПК-8. Дыялектычна мысліць і аргументаваць свій пункт погляду, аналізаваць факты і прагназаваць развіццё падзей, распрацоўваць рашэнні з улікам эканамічных, сацыяльных і этычных патрабаванняў, ацэніваць гістарычныя і сучасныя праблемы і тэндэнцыі, рыхтаваць навуковыя матэрыялы, рэфераты, агляды, рэцэнзіі.

ПК-10. Прадстаўляць вынікі работы ў выглядзе справаздач, рэфератаў, артыкулаў, якія аформлены згодна з патрабаваннямі і выкананы на падставе сучасных сродкаў рэдагавання і друку;

– навукова-даследчая дзейнасць:

ПК-11. Фармуляваць і вырашаць задачы, якія ўзнікаюць у працэсе навукова-даследчай і педагагічнай дзейнасці і патрабуюць паглыбленых прафесійных ведаў.

ПК-12. Выбіраць неабходныя метады даследавання, мадыфікаваць існуючыя і распрацоўваць новыя метады згодна з задачамі канкрэтнага даследавання;

– педагагічная дзейнасць:

ПК-13. Творча прымяняць атрыманыя веды і набытыя навыкі ў прафесійнай дзейнасці;

– інавацыйная дзейнасць:

ПК-18. Працаваць з навуковай і метадычнай літаратурай.

Пры вывучэнні дысцыпліны мэтазгодна выкарыстоўваць метады навучання: тлумачальна-ілюстратыўны, эўрыстычны, кейс-метад (метад сітуацыйнага аналізу), метад уключанага назірання, вучэбнае мадэляванне практыка-арыентаванага навуковага даследавання.

У рамках фарміравання сучасных сацыяльна-асобасных і сацыяльна-прафесійных кампетэнцый будучых спецыялістаў пры правядзенні семінарскіх заняткаў выкарыстоўваюцца методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай працы.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Хранатоп и стыль беларускай культуры” ўсяго прадугледжана 52 гадзіны, з якіх аўдыторных заняткаў 34 гадзіны для дзённай формы атрымання адукацыі. З іх 20 гадзін – лекцыі, 14 гадзіны – семінары. Для завочнай формы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

атрымання адукацыі: 8 гадзін – аўдыторныя заняткі. З іх 6 гадзін – лекцыі, 2 гадзіны – семінары.

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Уводзіны

Змест дысцыпліны “Хранатоп і стыль беларускай культуры”, яе тэматычная сувязь з шэрагам гуманітарных дысцыплін (тэорыя і гісторыя культуры, культуралогія, семіётыка культуры, герменеўтыка, аксіялогія культуры, мастацкая культура, літаратура і інш). Роля і месца вучэбнага курса ў падрыхтоўцы будучых культуролагаў да сацыякультурнай дзейнасці. Прадмет, мэта і задачы, структура вучэбнага курса. Віды вучэбных заняткаў. Крыніцы і вучэбная літаратура. Формы кантролю.

## Тэма 1. Культуралагічны аналіз-сінтэз

Семіятычная логіка і фарміраванне кантэксту. Этапы культуралагічнага аналізу-сінтэзу: сінтактычны (апісальны), семіятычны (кантэкстуальны), прагматычны (інкультурацыйны). Модусы (узроўні) фарміравання культурнага сэнсу: творчы імпульс – хранатоп (артэфакт, тэкст) – праблемная сітуацыя – вербальнае выказванне.

Ключавыя лексікоды – форма вербальных сімвалаў, якія адлюстроўваюць дынаміку інтэнцыяў культурнага сэнсу: матыў – тэма (праблема), топас (культурэма) – рубрыка, канцэпт мастацкі – канцэпт ідэацыйны.

Тэорыя выказвання: універсальная роля вербальнай сімволікі. Сэнсавыя ёмкасці паняцця. Праца І. Канта “Крытыка здольнасці выказвання”. Унутраная форма мовы (В. Гумбальт, А. Патабня) і дыялагічная канцэпцыя культуры. Дынаміка сэнсаў: рух ад палілогу да маналагічнага выказвання нацыі.

Культуралагічны аналіз-сінтэз на прыкладзе “Плыта “Медузы” Т.Жэрыко.

## Тэма 2.Суб’ект культуры

Халістычны (цэласны) характар і дынаміка структуры суб’ект – чалавечая дзейнасць – культурны тэкст.

Індывідуальная і калектыўная формы жыццядзеяння суб’екта культуры: асоба, творчая меншасць, нацыя, масавае грамадства. Мова, нацыянальная культура і творчы патэнцыял ас обы. Мысліцелі і асветнікі пра гаманізуючую функцыю мовы (Цыцэрон, А. Дантэ, М. Гусоўскі, Ф. Скарына, Лаўксмін, Я. Колас і інш.).

Характар вырашэння праблемы калектыўнага суб’екта культуры. Нацыя і крэатыўная асоба ў беларускай культурфіласофіі. Гаспадарская

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

парадыгма ў беларускай культуры і вобраз кіраўніка. Маналог-выказванне – форма самасцвярджэння суб'екта ў палілогу.

Нацыянальны стыль: роля ў фарміраванні гістарычнага суб'екта.

### Тэма 3.Тэорыя хранатопу

Катэгорыі, якія вызначаюць прасторавыя і часавыя каардынаты – спосаб існавання культуры: айкумена, культурная прастора, ноасфера, інфасфера, хранатоп, стыль.

Прастора і час як формы пазнання ў працы І. Канта "Трансцэндэнтальная эстэтыка". Уяўленні пра час і прастору ў філасофіі экзістэнцыялізму М. Хайдэггера ("Быццё і час"). Час і прастора як творчыя перадумовы чалавечага жыцця ў фенаменалогіі. Працэс асэнсавання прасторы і часу ў сінергетыцы. Сакральная прастора і час у рабоце М. Эліядэ "Святое і мірское".

Хранатоп як фармальна-змястоўная катэгорыя (М. Бахцін "Формы часу і хранатопу ў рамане"). Структура прасторы і часу ў рамане. Сімвалы мастацкай прасторы і часу: дом (вобраз закрытага грамадства), прастор (вобраз адкрытай прасторы), парог, вакно, дзверы (мяжа).

Функцыі хранатопа. Віды прыватных хранатопаў па М. Бахціну.

Фальклорны хранатоп, яго ўплыў на мастацкую культуру. Праца М. Бахціна "Франсуа Рабле і народная культура Сярэднявякоўя і Рэнесансу" (1965).

Фарміраванне нацыянальнага хранатопу ў мастацкай культуры: ніва, храм-крэпасць, палац, горад, карчма, дом і інш. Вобразы і канструкты, каштоўнасныя абсалюты культурнай прасторы: дзяржава-дом, мова, закон, літвінізм, афіцыйная народнасць, мужыцкая праўда, славянафільства. Вобраз сацыяльнага часу ў творах В. Быкава, М. Савіцкага і інш.

### Тэма 4.Стыль культуры: эвалюцыя каштоўнаснага зместу і тэорыя паняцця

Паняцце стылю. Стыль як адна з уласцівасцей культуры (універсалізм, семіятычнасць, структураванасць, працэсуальнасць). Стыль эпохі, індывідуальны і нацыянальныя стылі.

Дыхатамія паняццяў "стыль жыцця" і "стыль культуры". Стылі чалавечага жыццядзеяння з аксіялагічнага пункту гледжання: біяфільства, дэкаданс, некрафільства.

Структурная марфалогія стылю. Амбівалентнае адзінства і ўнутраная дынаміка стылю. Стыль культуры: гістарычныя мадэлі і функцыі. Стылеўтваральны працэс: эпохі станаўлення, класічнай раўнавагі і акадэмізму, заняпаду (крызісу). Полістылёвасць адраджэнскіх і асветніцкіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рухаў: элінізм, барочнасць, постмадэрнасць ў гістарычна-культурным працэсе.

Праблема нацыянальнага стылю. Роля ў фарміраванні гістарычнага суб’екта. Ідэя этызацыі і эстэтызацыі быцця: “Сплачвайце доўг” В. Ластоўскага і “Чаму плача песня наша?” Я. Купалы. Эстэтызацыя кагнітыўнай дзейнасці ў культуры нацыянальнага адраджэння. “Песня пра зубра” М. Гусоўскага, “Сымон-музыка” Я. Коласа.

Беларускі суровы стыль. Формула быцця “У суровы век жыву сурова, жыць інакш не здолеў бы зусім” (А. Куляшоў): дынаміка структуры і выяўленчых сродкаў ад аксюмарона да сінэстазіі. Працы М. Бахціна “Творчасць Франсуа Рабле і народная культура эпохі Сярэдневякоўя і Рэнесансу” (1940) і “Эстэтыка слоўнай творчасці” (1974).

Роля мастацтвазнаўства і літаратуразнаўства ў фарміраванні нацыянальнага і індывідуальнага стылю. Роля педагогікі і адукацыі ў фарміраванні стылю жыцця.

## Тэма 5. Роля утапічнага мыслення ў фарміраванні хранатопу і стылю культуры

Гістарычная тыпалогія утапічнага мыслення: кніга мёртвых (піраміда), нірвана, той свет, вырай, ідылія. Вобраз ідэальнага горада ў мастацтве. Сучасныя тыпы утопіі: аргіястычны хіліязм, ліберальная ідэя, ашчаджальны кансерватызм. Праца К. Мангейма “Утопія і ідэалогія” (1929).

Жанравыя формы утопіі і антыутопіі. “Казка жыцця” як жанравая форма беларускай ідыліі. Тыпы антыутопіі ў мастацкай культуры: д’ябаліяда, зверыяда і інш. Семантыка сімвалаў у творах І. Босха, М. Зарэцкага, М. Лынькова, Д. Оруэла, В. Быкава.

Адметнасць антыутапічнага хранатопа ў тэкстах беларускай літаратуры і жывапісу XX стагоддзя.

## Тэма 6. Хранатоп і стыль ў гісторыка-культурным працэсе

Гістарычная тыпалогія культурнага працэсу. Стадыі сацыягенезу: абшчына, саслоўная дзяржаўнасць, агульнадэмакратычная рэспубліка, нацыянальна-дэмакратычная дзяржава-рэспубліка. Ключавы каштоўнасны арыенцір соцыуму (“ідэйны фокус” – Г.Зіммэль).

Кроўна-сваяцкі і каляндарна-земляробчы тыпы культуры.

Вытокі і станаўленне эстэтычных адносін да навакольнага свету. Манументальны стыль: мадэфікацыі натуралістычная, рэалістычная і абстракцыянісцкая. Заамарфная і антрапаморфная сімволіка пластыкі і наскальных малюнкаў. Парадыгмальная інтэнцыя выжыванне чалавечае.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Звярыная сімволіка стылю. Паляўнічы эпас. Манументальны стыль у архітэктуры. Мегалітычныя храмы: дальмены, менгіры, кромлехі. Вызначальны “ідэйны фокус” – жыць чалавекам. Комплексы кентаўра, ваўкалака, русалкі. Беларускі ліра-эпас: культ нівы і гаспадара ў каляндарнай паэзіі. Хранатоп. Адлюстраванне парадыгмальнай функцыі нацыянальнага стылю ў ключавых канцэптах спадчына, скарб, шлях.

Кананічная (егіпецкая) мадэль стылю ў культуры саслоўна-каставага тыпу.

Егіпецкі канон. Ключавы стымул – валоданне людзьмі. Культ фараона – бога добрага. Афіцыйная ідэалогія для ніжэйшых слаёў. Ідэя непарушнай вечнасці без будучыні. Адметнасць хранатопу. Рацыяналізм і геаметрычны прынцып канструявання культурнай прасторы. Сацыяльная функцыя піраміды і сфінкса. Фальклярызацыя культурнага працэсу ў Егіпце. Інтэр’ер і экстэр’ер піраміды – дыхатамія народнай аксіялогіі і афіцыёзу. Мемфіскі канон: адраджэнне каштоўнасці мацярынства. Стыль Амарны: рэнесансная арыентацыя на каштоўнасць кампанента ў структуры. Індывідуальны стыль скульптара Тутмэса: экспрэсіўная манера, лірычная афарбоўка партрэта. Вобразы Неферціці і Эхнатона. Сістэма прапорцый, каляровы і іканаграфічны каноны. Псіхалагізм і драматычны лірызм “фаюмскага партрэта”.

Мілітарная мадэль саслоўна-каставай культуры ў Месапатаміі.

Манументалізм і культ жорсткасці. Зікураты, вісячыя сады, стэлы. Школа: жанр школьнай гутаркі. Адсутнасць філасофскай рэфлексіі ва ўмовах тыраніі. Разбурэнне культурнай прасторы. Абясцэньванне народнай эстэтыкі і народнай канцэпталогіі. Народны “Эпас пра Гільгамеша”: прадбачанне цывілізацыйнай катастрофы і пошукі шляхоў уратавання.

Кастава-абшчынная арганізацыя соцыуму.

Спецыфіка духоўнага вызвалення: адмаўленне кастаў, духоўнае ачышчэнне, медытацыя, нейтральнасць у адносінах да нірваны. Стыль негвалтоўнага ўдасканалення грамадства. Фарміраванне стылю рыці. Канцэпцыя жыцця як працэсу перажывання і медытацыі. Адмаўленне шуньяты – мітусні і пустаслоўя. Катэгорыя мокша – мэта жыцця як служэнне людзям. Сімвалы культурнай прасторы: палац, парк, маўзалей. Станаўленне нацыянальных стыляў у культуры бенгалі, хіндзі, канада, тамільскай. Адраджэнне творчай індывідуальнасці рэнесанснага тыпу. Рабіндранат Тагор і Прэмчанд у гісторыі індыйскага адраджэнскага руху ХХ ст.

Кастава-бюракратычная (далёка-ўсходняя) культура.

Першапачатковыя канстанты стылю чалавечага быцця ў народнай культуры Кітая. Адлюстраванне першапачатковага вопыту пазнання ў форме звярынай сімволікі: тао-тэ (галава дракона, тайфун, уладар), фенікс (час

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

улагоджвання, імператрыца) і інш. Канфуцыянскі канон: яшма, апрацаваны камень, выхаваўча-дыдактычная накіраванасць культуры. Даасіцкі канон: неапрацаванае дрэва, супрацьпастаўленне этычных сістэм, прынцып нядзеяння. Агульнанацыянальны канцэпт дао. Парадыгма сюньцзы (дасканалы кіраўнік). Ідэя ўпарадкаванай патрыярхальнай утопіі ў кітайскай літаратуры. "Цвёрды" ("замагільны") стыль бюракратыі. "Тэракотавая армія" – ахова тырана ў замагільным свеце. Стыль шаньшуй ("горы-воды"). Імпрэсіянізм у пейзажным жывапісе. Самакаштоўнасць кампанентаў і цэласнасць структуры – характэрныя асаблівасці стылю ў архітэктуры.

### Тэма 7. Гістарычная дынаміка стылю

Алігарха-дэмакратычны (еўрапейская  Антычнасць) стыль культуры.

Цэнтральная ідэя – права на валоданне вышэйшымі каштоўнасцямі полісу – Логасу. Эстэтыка прапарцыянальнасці і раўнавагі. Трыумф народнасці ў смехавым (дыяніскім ) і трагедыйным (сафоклаўскім) канонах. Персанажы – топасы і псіхічныя комплексы Хронаса, Праметэя, Медэі і інш. Комплекс Мінатаўра: аксіялагічнае папярэджанне аб пагрозе выраджэння на вяршыні цывілізацыйнага прагрэсу. Дыяхронная дынаміка двух стыляў жыцця: жудасны свет багоў-тытанаў і эстэтызаваны свет багоў-алімпійцаў. Праблема рабства. Цэзарызм, біфуркацыя і разбурэнне эстэтыкі грамадзянскага стылю жыцця ў імперскім Рыме. Комплексы Клеапатры і Нярона. Эстэцтва ў агульнай карціне крызісу і воля да аноміі. Хрысціянская пазачасавая утопія. Сацыялізацыя ідэі чалавечай роўнасці.

Феадальна-саслоўны тып культуры.

Ідэя валодання зямлёй і людзьмі. Фарміраванне трэцяга саслоўя і фалькларызацыя стылю жыцця ў горадзе. Эмблематычнасць, паэма знаку і карнавалізацыя на шляху да сістэматычнага стылю еўрапейскага Рэнесансу. Стыль мастацтва Паўднёвага рэгіёну: эстэтыка і канцэпцыя ідэальнага горада і ідэальнага чалавека – творца быцця. "Кніга пра жывапіс" Леанарда да Вінчы. Паўночны Рэнесанс: арыентацыя на дакладнасць адлюстравання, папярэджанне аб пагрозе бездухоўнасці – антыпод паўднёваму гігантызму ідэальнага характару.

Стадыя агульнадэмакратычнай дзяржавы-рэспублікі.

Ліквідацыя саслоўна-каставых структур. Ідэя суверэннага суб'екта – асобы, нацыі, дзяржавы. Дыхатамія ідэі-імператыву: "валоданне рынкам" і акультурацыя чалавечага жыццядзеяння. Матыў утварэння новага соцыуму – новага стылю жыцця – "без войнаў, рабства і багоў", "на новы лад, каб жыць нанова". Нямецкая класічная філасофія і рамантычная эстэтыка: сцверджанне адзінства свабоды, красы і кантынуальнасці. Крызіс гандлёвага грамадства і дэградацыя стылю. Адкрыццё патэнцыялаў біяфільства. Новая парадыгма:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

узбуйненне суб’ектаў даследавання, пераход ад стылістыкі да тыпалогіі. Працы Г. Вёльфліна, К. Кларка, Э. Паноўскага. Рэабілітацыя чалавекатворчай функцыі эстэтыкі. Паэтычныя трактаты – паэмы жыцця ў беларускай літаратуры – на фоне паэтаў знаку. Эстэтыка прастору ў творчасці Я. Коласа, фальклорная мадэль культурнага героя ў творчасці Я. Купалы, М. Багдановіча. Новая рэлігія – сакралізацыя і этызацыя прыроды.

### Тэма 8. Топасы як апазнавальныя знакі культурнай прасторы

Паняцце топасу. Суровы стыль у культуры XX стагоддзя. Топіка “чалавек і стыхія” ў мастацтве. Праблема “часу без быцця”. Семантычны аналіз топасаў лабірынт, агонь, яма (на матэрыялах мастацкай літаратуры, архітэктуры, выяўленчага мастацтва).

Праблема “чалавек у свеце” ў беларускай культуры. Яе мадэфікацыі ў топіцы:

-топас “свет бязмежны – мой дом” (Я. Колас). Персаналіі і тэкст: Я. Колас “Новая зямля”, “Сымон-музыка”, “На ростанях”; Л. Гараўскі “Канюшына цвіце”, “На Радзіме”; Я. Драздовіч “Стадолішча”, “Курган”, А. Карніцкі “Прыдарожныя бярозы”.

-топас “дарога да храма”. Персаналіі і тэкст: І. Левітан “Вячэрні звон”, “Залатая восень”, “Хаты”, Прыцемкі”, “Летні вечар”.

-прагалы. Персаналіі і тэкст: І. Шышкін “Жыта”, “Ручэй у лесе”, “Раніца ў сасновым лесе”, “Высечка лесу”, “Сярод даліны роўнае”, “На поўначы дзікай”.

Семантычны змест дадзеных топасаў. Характарыстыка хранатопу, выяўленне стылёвых адметнасцей. Дэмасавізацыя і рэструктурызацыя часу ў сучаснай культуры.

### Тэма 9. Стылёвая адметнасць беларускай школы іканапісу

Асноўныя этапы фарміравання і развіцця беларускай іканапіснай школы. Іканаграфічны канон у выяўленчым мастацтве: ідэйная аснова і яе ўвасабленне. Фальклярызацыя хрысціянства на Беларусі. Уплыў народнай філасофіі на станаўленне беларускай школы іканапісу (“Маці Боская Замілаванне Жыровіцкая”, “Маці Боская Адзігітрыя Мінская” “Нараджэнне Маці Боскай” Пятра Яўсеевіча з Галынца, “Маці Боская Адзігітрыя Неўвядальны цвет”, “Пакланенне вешчуноў”). Тыпаж у беларускай іконе. Стылёвыя адметнасці. “Беларуская рэзь навылётная” ў іканастасах. Роля беларускага іканапісу ў развіцці хрысціянства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

(дзённае аддзяленне)

| № раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Кантралюемая самастойная работа | Форма кантролю ведаў студэнтаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінары | | |
| 1. | Уводзіны | 1 | | | |
| 2. | Тэма 1. Культуралагічны аналіз-сінтэз | 1 | | | |
| 3. | Тэма 2. Суб'ект культуры | 2 | | | |
| 4. | Тэма 3. Тэорыя хранатопу | 2 | 1 | 1 | тэсціраванне |
| 5. | Тэма 4. Стыль культуры: эвалюцыя каштоўнаснага зместу і тэорыя паняцця | 2 | 1 | 1 | адказы на кантрольна-навучальныя пытанні |
| 6. | Тэма 5. Роля ўтапічнага мыслення ў фарміраванні хранатопу і стылю культуры | 2 | 2 | | |
| 7. | Тэма 6. Хранатоп і стыль у гісторыка-культурным працэсе | 2 | 2 | 1 | абмеркаванне вынікаў індывідуальных заданняў |
| 8. | Тэма 7. Гістарычная дынаміка стылю | 2 | 2 | 1 | вуснае апытанне |
| 9. | Тэма 8. Топасы як апазнавальныя знакі культурнай прасторы | 2 | 2 | 1 | падбор эмпірычнага матэрыялу |
| 10. | Тэма 9. Стылявая адметнасць беларускай школы іканапісу | | 2 | 1 | эсэ |
| | Разам… | 16 | 12 | 6 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

(завочнае аддзяленне)

| № раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | |
|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінары |
| 1. | Уводзіны | 1 | |
| 2. | Тэма 1. Культуралагічны аналіз-сінтэз | 1 | |
| 3. | Тэма 2. Суб’ект культуры | | 1 |
| 4. | Тэма 3. Тэорыя хранатопу | 1 | |
| 5. | Тэма 4. Стыль культуры: эвалюцыя каштоўнаснага зместу і тэорыя паняцця | 1 | |
| 6. | Тэма 5. Роля ўтапічнага мыслення ў фарміраванні хранатопу і стылю культуры | 1 | |
| 7. | Тэма 6. Хранатоп і стыль у гісторыка-культурным працэсе | 1 | |
| 8. | Тэма 7. Гістарычная дынаміка стылю | 1 | |
| 9. | Тэма 8. Топасы як апазнавальныя знакі культурнай прасторы | 1 | |
| 10. | Тэма 9. Стылявая адметнасць беларускай школы іканапісу | | 1 |
| | Разам… | 8 | 2 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Літаратура

*Асноўная*

1. Анисимов, А. “Культурное время” и образы времени в культуре / А. Анисимов. – М.: Знание, 1999. – 350 с.

2. Ахундов, М.Д. Концепция пространства и времени: истоки, эволюция, перспектива / М.Д. Ахундов. – М.: Наука, 1982. – 224 с.

3. Барт, Р. Избранные работы: Семиотика. Поэтика Р. Барт. / Р. Барт. – М.: Прогресс, Универс, Рея, 1989. – 616 с.

4. Бауэр, В., Дюмотц И., Головин С. Энциклопедия символов / В. Бауэр, И. Дюмотц, С. Головин. — М.: Наука, 1995. – 350 с.

5. Бахтин, М. Творчество Франсуа Рабле и народная культура средневековья и Ренессанса / М. Бахтин. — М.: Наука, 1990. – 550 с.

6. Бахтин, М.М. Эстетика словесного творчества / М.М. Бахтин. — М.: Иск-во, 1979. – 423 с.

7. Белый А. Символизм как миропонимание / А. Белый. – М.: Республика, 1994. – 528 с.

8. Вёльфлин, Г. Ренессанс и барокко / Г. Вёльфлин. – М.: Азбука, 2004. – 288 с.

9. Вёльфлин, Г. Основные понятия истории искусств. Проблема эволюции стиля в новом искусстве: перев. с нем / Г. Вёльфлин. – М.- Л.: Academia, 1930. – 289 с.

10. Виноградов, В.В. Проблема авторства и теория стилей / В.В. Виноградов. – М.: Издательство художественной литературы им. Гафура Гуляма, 1961. – 616 с.

11. Власов, В.Г. Стили в искусстве: словарь / В.Г. Власов. – СПб.: Кольна, 1995. – Т. 1. – 456 с.

12. Дашкова, Е.В. Понятие «стиль»: генезис и категориальные характеристики: [Электронный ресурс] // Аналитика культурологии. – 2009. – № 2 (14). – URL: http://www.analiculturolog.ru/archive/item/374-article_3.html?tmpl=component&print=1. – Дата доступа: 10.06.2012.

13. Дорошевич, Э.К. Символы в контексте культуры / Э.К. Дорошевич. – Мн.: Университетское, 2001. – 236 с.

14. Иванов, В. Избранные статьи по семиотике и истории культуры. Статьи о русской литературе. Языки русской культуры / В. Иванов – М.: Наука, 2000. — 340 с.

15. Иоффе, И. Культура и стиль / И. Иоффе. – Л.: ГМНИИ, 1927. – 450 с.

16. Кон-Винер, Э. История стилей изобразительного искусства: пер с нем. / Э. Кон-Винер. – 2-е изд., испр. – М.: КД ЛИБРОКОМ, 2009. – 222 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

17. Крук, Я. Сімволіка беларускай народнай культуры / Я. Крук. – Мн.: Беларусь, 2001. – 350 с.

18. Рикер, П. Конфликт интерпретаций / П. Рикер. – М.: Медиум, 1995. – 300 с.

19. Парахонский, Б. А. Стиль мышления. Философские аспекты анализа стиля в сфере познания, культуры, языка / Б.А. Парахонский. – Киев: Навукова думка, 1982. – 182 с.

20. Панофский, Э. Смысл и толкование изобразительного искусства / Э. Панофский. – СПб.: Наука, 1999. – 300 с.

21. Померанц, Г. Русская идея или русский стиль / Г. Померанц // Новое время. – 1993. – № 31. – С. 44 – 50.

22. Рагуля А.У. Этнічны семіёзіс і нацыянальная дактрына: Кн. 1: этнасеміётыка / А.У. Рагуля. – Мінск: выд. В. Хурсік, 2018. – 224 с.

23. Лосев, А. Знак. Символ. Миф / А. Лосев. – М.: Искусство, 1982. – 450 с.

24. Лотман, Ю.М. Семиосфера / Ю.М. Лотман. – СПб.: Иск-во, 2000. – 704 с.

25. Устюгова, Е.Н. Стиль и культура: опыт построения общей теории стиля / Е.Н. Устюгова. — 2-е изд. – СПб.: Изд-во ИД СПбГу, 2006. – 260 с.

26. Успенский, Б.А. Семиотика искусства / Б.А. Успенский. – М.: Языки русской культуры, 1995. – 360 с.

27. Хайдеггер, М. Время и бытие / М. Хайдеггер. – М.: Республика, 1993. – 447 с.

28. Чечот, И.Д. Барокко как культурологическое понятие. Барокко в славянских культурах / И.Д. Чечот. – М.: Наука, 1982. – 392 с.

*Дадатковая*

Крыніцы

1. Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь. Мастацтва XV – пачатку XX стагоддзя. Альбом / аўтары-склад.: Ю.А. Піскун, Н.Ф. Высоцкая, А.У. Карпенка і інш. 2-е выданне – Мінск: Беларусь, 2006. – 336 с.

2. Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь. Мастацтва 1920-1950-ых гадоў. Альбом / аўтары-склад. В.А. Архіпава і інш.]. – Мінск: Беларусь, 2006. – 394 с.

3. Михаил Савицкий = Mikhail Savitsky: фотоальбом / авт. идеи и рук. проекта В. Прокопцов; авт. текста и сост. Б. Крепак; фото Ю. Иванова [и др.]; пер. на англ. яз. С. Сиверина. — Минск: Беларусь, 2008. — 171 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вучэбнікі і вучэбныя дапаможнікі

1. Иконникова, С.Н., Большакова, В.П. Теория культуры: учебное пособие / С.Н. Иконникова, В.П. Большакова. – СПб.: Питер, 2008. – 592 с.

2. Лыч, Л. Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. – Мн.: Экаперспектыва, 1996. – 453 с.

4. Флиер, А. Культурология для культурологов / А. Флиер. – М.: МГУКИ, 2009. – 705 с.

Даследаванні

1. Абдзіраловіч, І. Адвечным шляхам: дасьледзіны беларускага сьветапогляду / І. Абдзіраловіч – Мн.: выдавецтва Навука і тэхніка, 1993. – 44 с.

2. Беларуская думка XX стагоддзя. Філасофія, рэлігія, культура. Анталогія. Укладанне / прадмова і апрацаванне Ю. Гарбінскага. – Варшава, 1998. –741 с.

3. Бромлей, Ю.В. Очерки теории этноса / Ю.В. Бромлей. – М.: Наука, 1983. – 412 с.

4. Гачев, Г. Национальные образы мира / Г. Гачев. – М.: Совет. писатель, 1988. – 447 с.

5. Дорошевич, Э.К., Конон, В.М. Очерк истории эстетической мысли Белоруссии / Э.К. Дорошевич, В.М. Конон. – М.: Иск-во, 1972. – 320 с.

6. Дробаў, Л.М. Беларускія мастакі XIX стагоддзя / Л.М. Дробаў. – Мінск: Беларусь, 1971. – 112 с.

7. Каган, М.С. Философская теория ценностей / М.С. Каган. – СПб.: Петрополис, 1997. – 205 с.

8. Тейяр де Шарден, П. Феномен человека / П. Тейяр де Шарден. — М.: Наука, 1987. – 240 с.

9. Швейцер, А. Благоговение перед жизнью / А. Швейцер. – М.: Прогресс, 1992. – 576 с.

10. Элиаде, М. Священное и мирское / М. Элиаде. – М.: Изд-во Моск. ун-та, 1994. – 144 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае работу з навуковай, навукова-папулярнай, вучэбна-метадычнай, хрэстаматыйнай літаратурай, вывучэнне студэнтамі асобных пытанняў дысцыпліны, аналіз канкрэтных сітуацый, падрыхтоўку да семінарскіх заняткаў, заліку і экзамену.

Пры вывучэнні дысцыпліны выкарыстоўваюцца наступныя віды самастойнай работы студэнтаў:

– пазааўдыторная, у тым ліку кіруемая самастойная работа;
– аўдыторная (кантралюемая) самастойная работа;
– творчая, у тым ліку навукова-даследчая работа.

## Формы выканання самастойнай работы:

– напісанне рэферата;
– распрацоўка візуальнай прэзентацыі;
– пісьмовыя адказы на тэсты;
– пісьмовае выкананне індывідуальных заданняў;
– пісьмовае выкананне кантрольных работ
–падрыхтоўка да ўдзелу ў навуковых і навукова-практычных канферэнцыях, семінарах і круглых сталах.

## Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці

Для ацэнкі дасягненняў па вучэбнай дысцыпліне «Хранатоп і стыль беларускай культуры» і дыягностыкі фарміравання кампетэнцый студэнтаў выкарыстоўваецца наступны дыягнастычны інструментарый:

– удзел студэнта і выступленне яго на семінары з падрыхтаваным інфармацыйным (тэматычным) паведамленнем і інш.;
– абарона заданняў, выкананых на семінарскіх занятках;
– падрыхтоўка рэфератаў па асобных тэмах, раздзелах дысцыпліны;
– абарона выкананых індывідуальных (групавых) заданняў па кіруемай самастойнай рабоце;
– вусныя бягучыя кантрольныя апытанні па асобных тэмах пад час заняткаў;
– тэставы кантроль;
– залік і экзамен па дысцыпліне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Рэкамендаваныя метады (тэхналогіі) навучання

Да эфектыўных педагагічных тэхналогій, якія садзейнічаюць далучэнню студэнтаў да пошуку і выкарыстання ведаў, набыццю вопыту самастойнага вырашэння задач, адносяцца:

– тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;

– тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;

– праектныя тэхналогіі;

– камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусія, прэс-канферэнцыі, вучэбныя дэбаты і іншыя актыўныя формы і метады);

– гульнявыя тэхналогіі, у межах якіх студэнты ўдзельнічаюць у дзелавых, ролевых, імітацыйных гульнях і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ